ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.03 (3267) ● ЧАЦВЕР, 19 СТУДЗЕНЯ, 2012

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭТ WWW.GOLAS.BY

Абрад у спадчыну
На стары Новы год у вёсцы Семежава, што ў Капыльскім раёне, калядаваць выходзяць цары Стар. 2

Перш за ўсё прыгажосць...
Вальмен Аладаў летась атрымаў ганаровы прыз “Дойлід Беларусі” Стар. 3

Ладзілі “Шчадрэц” — з мясцовым каларытам!
Унікальны калядны абрад на стары Новы год быў прадстаўлены ў Музеі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах пад Мінскам Стар. 4

ПАДЗЕЯ

Сто моваў Янкі Купалы

У юбілейны год Песняра самай вялікай пашанай і знакам найглыбокай павагі да знакамітага земляка будзе імкненне перачытаць ягоныя творы

Іван Ждановіч

Кажуць, вялікае бачыцца на адлегласці… У пэўнай ступені выслоўе можна аднесці і да класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. Уявіце сабе: яго творы перакладзены больш чым на сотню моваў свету! А значыць, менавіта праз творчасць Песняра, першага народнага паэта Беларусі, мільёны людзей Зямлі лепш ведаюць і пра сам народ, яго доўгі шлях на “пачэсны пасад між народамі”, змаганне за права “людзьмі звацца”. Цяпер, вядома ж, беларуская прысутнасць у свеце выяўляецца і ў сферы эканомікі, навукі, нават сучасных ІТ-тэхналогій... І ўсё ж людзі розных краін і народаў менавіта дзякуючы культурным кантактам больш даведваюцца адзін пра другога.

Зрэшты, кожны народ мае знакавых асобаў, якія сілай таленту не толькі вызначаюць галоўныя кірункі развіцця мовы, культуры, але і даюць адказ на пытанне “хто мы ёсць у гэтым свеце”, закладваюць духоўныя арыенціры для многіх пакаленняў. “Такія творцы прыносяць славу і пашану народу, а з цягам часу становяцца яго сімваламі, — падкрэсліў на адкрыцці юбілейнага Купалаўскага года міністр культуры Беларусі Павел Латушка. — Важнейшым для беларусаў стала імя Янкі Купалы, гэта фактычна наш нацыянальны сімвал”.

Сёлета адзначаюцца 130-я ўгодкі Песняра. У Беларусі і замежжы спланаваны шэраг мерапрыемстваў, культурных акцый з удзелам вядомых дзеячоў культуры і мастацтва, творчай і навуковай інтэлігенцыі. Сімвалічна, што святкаванне пачалося з урачыстасці менавіта ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. На ёй гаварылася: будуць выдавацца новыя тэматычныя і літаратурна-мастацкія зборнікі, ствараюцца новыя экспазіцыі ў музеях, дакументальна-публіцыстычныя праграмы па Купалавых творах на тэлебачанні. У планах і правядзенне Рэспубліканскага свята паэзіі, факсімільнае перавыданне кнігі Янкі Купалы “Шляхам жыцця”, кніг у серыях “Жыццё знакамітых людзей Беларусі” і “Школьная бібліятэка”. Выдаткаваны сродкі на добраўпарадкаванне мемарыяльных месцаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю Купалы, капрамонт будынка Купалаўскага музея.

За каштоўны падарунак ад прыхільнікаў творчасці Янкі Купалы ўдзячна дырэктар музея Алена Ляшкевіч



Каталог аўтографаў Я. Купалы

Павел Латушка згадаў на ўрачыстасці словы Уладзіміра Караткевіча: “Мы маем шмат каго... І ўсё адно Купала застаецца першай нашай любоўю, нашымі вачыма, нашым сумленнем, нашым вечна жывым сэрцам”. Таму і ролю Янкі Купалы ў станаўленні беларускай нацыі, мовы і дзяржаўнасці цяжка пераацаніць. Менавіта ён далучыў беларускую культуру да сусветнай, а дзякуючы ягонай творчасці пра беларусаў ведаюць у многіх краінах. Адзін толькі верш “А хто там ідзе?” гучыць на 84 мовах.

Важна, што ўдзячныя нашчадкі змаглі зберагчы і актуалізаваць купалаўскую спадчыну. Цяпер спецыялісты шмат робяць, каб беражліва перадаць назбіраныя духоўныя скарбы тым, хто прыйдзе пазней. Як вядома, калекцыя Купалавых аўтографаў — адна з найбольш каштоўных у ягоным музеі. Гэта важкі набытак айчыннай культуры, асобныя ж рэчы Песняра ўваходзяць і ў сусветную скарбніцу. Каб больш шырока прадставіць Купалавы рарытэты ў свеце, у музеі пры падтрымцы Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКА рэалізаваны ўнікальны праект — падрыхтаваны і выдадзены як у электронным варыянце, так і ў скарочаным друкаваным выглядзе каталог “Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы”. Гэта, як лічыць дырэктар Купалаўскага музея Алена Ляшковіч, вельмі паспрыяе пашырэнню беларускіх нацыянальных каштоўнасцяў у міжнароднай інфармацыйнай прасторы. Да таго ж рукапісы, якія апублікаваны, будуць больш даступнымі для даследчыкаў і лепш захаваюцца.

Пад час прэзентацыі каталога міністр культуры выказаў падзяку Аляксандру Надсану, прадстаўніку беларускай супольнасці ў Лондане, які перадаў шэраг рукапісаў, выкарыстаных пры падрыхтоўцы выдання. Павел Латушка запрасіў усіх, хто цікавіцца беларускай культурай, часцей наведваць музейныя ўстановы, звязаныя з жыццём і творчасцю паэта, а таксама шматлікія мерапрыемствы, прымеркаваныя да юбілею Песняра. І заклікаў усіх у гэты год перачытаць Янку Купалу.

ЗЕМЛЯКІ

Мелодыі матуліных песень

Сафію Антоненку ды іншых суайчыннікаў, якія жывуць цяпер у расійскім Барнауле, звязваюць з Бацькаўшчынай не толькі канкрэтныя справы, але і светлыя ўспаміны

Іван Іванаў

Мінулым летам Сафіі Антоненцы, якая ўзначальвае праўленне Беларускага зямляцтва на Алтаі, зноў пашчасціла наведаць Беларусь. Дарэчы, працуе ў Барнауле і беларуская нацыянальна-культурная аўтаномія на чале з Мікалаем Крысковічам, некаторыя мерапрыемствы землякі ладзяць разам. І на краявых фестывалях яны побач. Алтайскія беларусы адзначаюць Дзень Незалежнасці, Дзень Перамогі, Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі...

Як трапіла яна ў далёкі край? Бацькі Сафіі Васільеўны, па прозвішчы Анціховічы, у сярэдзіне 50-х у пошуках лепшай долі паехалі асвойваць цаліну, потым перабраліся на Алтай. Шасцёра дзяцей было ў іх, мая субяседніца — найменшая. “Пусцілі карані ў сяле Калыванаўскае, дзе Паўлаўскі зернесаўгас быў, — узгадвае. — Там мае бацькі і пахаваны, з іх дзяцей засталіся адно мы з братам. Шмат сваякоў пераехала да нас, былі ў сяле і беларусы Грыневічы з Гомельшчыны, Беер-Траццяковы... Малодшыя амаль усе перабіраліся ў горад, і я ў тым ліку. Скончыла Алтайскі політэхнічны інстытут, працавала на вытворчасці, апошнія 16 гадоў — кансультант у краявым заканадаўчым сходзе”.

Сафія Антоненка ўпершыню была ў складзе вялікай, амаль 20 чалавек, дэлегацыі краю, якая штогод прыязджае ўмацоўваць алтайска-беларускія кантакты. → Стар. 2

ТРАДЫЦЫІ

Абрад у спадчыну

На стары Новы год у вёсцы Семежава, што ў Капыльскім раёне, калядаваць выходзяць цары

Кацярына Мядзведская

У семежаўскіх хатах на Каляды заўсёды чакаюць незвычайных цароў-калядоўшчыкаў

Семежаўскі старажыл Мікалай Скамароха ўзгадвае, як пасля вайны на стары Новы год з 13 на 14 студзеня заўсёды хадзілі мясцовыя ражаныя хлопцы па хатах, песні спявалі, танчылі, а гаспадары ім дзякавалі, шчодра частавалі. Бывала, ён і сам удзельнічаў у калядаванні, а сёння дзед Мікола навучае ўнукаў: у якую вопратку нараджацца, як у хату ўваходзіць, каму кланяцца трэба.

Абрад "Калядныя цары" жыве ў Семежаве ажно з XVIII стагоддзя, з таго часу, як там дыслацыраваўся атрад царскай арміі. З той даўніны, дарэчы, і назва: калядавалі ж дзеля забавы салдаты. Пазней пра традыцыю забыліся. І толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска зноў пачала сустракаць стары Новы год разам з "царамі". Цалкам адноўлены абрад быў у 1996 годзе, калі ім зацікавіліся гісторыкі, навукоўцы, этнографы-фалькларысты.

Вядома, што гэта ўнікальная дзея занесена ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. І такая пашана да мясцовага абрада зусім невыпадковая, бо распаўсюджаны ён у адзіным у свеце месцы — беларускім Семежаве.

...Для рытуалу хлопцы апранаюцца ў спецыяльныя строі: белыя штаны і кашулі. Кожны "цар" на грудзях завязвае чырвоныя паясы з геаметрычным арнаментам. На галовах — высокія шапкі з рознакаляровымі стужкамі. Працэсія наведвае вяскоўцаў, разыгрывае перад імі драму "Цар Максімільян". Сярод калядоўшчыкаў ёсць і традыцыйныя персанажы — Дзед і Баба. "У кожнай хаце рыхтуюцца да прыходу "цароў", — адзначае дырэктар семежаўскага Цэнтра культуры і адпачынку Таццяна Шаура. — Гаспадыні пякуць пірагі, прыбіраюць у хаце, купляюць для дзяцей цукеркі. Малыя ж развучваюць вершы, песні і таксама ходзяць па вёсцы". Свята доўжыцца да позняй ночы — "цары" запальваюць паходні, што надае абраду таямнічасць і незвычайную прыгажосць.

Абрад на Капыльшчыне даследавалі этнограф Таццяна Кухаронак, загадчык кафедры Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў Вячаслаў Калацэй, эксперт Ала Сташкевіч. У апошні час зацікавілася ім і супрацоўнікі арганізацыі "Адпачынак у вёсцы". "Год таму мы пабывалі ў Семежаве, пад уражаннямі ад абрада "Калядныя цары" быў распрацаваны праект "Турызм у рамках мясцовых супольнасцяў як сродак захавання, фарміравання партнёрства і развіцця сельскіх тэрыторый", які быў падтрыманы Праграмай малых грантаў Пасольства ЗША", — гаворыць старшыня арганізацыі "Адпачынак у вёсцы" Валерыя Кліцунова.

Сёлета пад час святочных дзеяў прайшоў і навуковы семінар "Развіццё турызму як сродак захавання элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны", у якім давялося паўдзельнічаць і маёй суразмоўніцы. "Прыемна, што "Цары" былі і застаюцца маладзёжным святам, — адзначае Валерыя Кліцунова. — Сучасныя хлопцы з задавальненнем працягваюць традыцыі продкаў. Семежава даволі вялікая вёска, там шмат дзяцей і юнакоў — і гэта, безумоўна, залог таго, што старажытны абрад будзе жыць".

Дарэчы, сёлета калектыў "Цары" Семежаўскага цэнтра культуры і адпачынку стаў лаўрэатам Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі за вялікую працу па вывучэнні, аднаўленні і захаванні народных традыцый.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Шчасце ў дом прыносіць бусел

Традыцыйнымі Калядамі сустракалі праваслаўнае Ражджаство госці і супрацоўнікі Музея Максіма Багдановіча ў Яраслаўлі

Кожны з наведвальнікаў змог паспрабаваць сябе ў ролі калядоўшчыка: хтосьці стаў сімвалам дабрабыту — Казой, нехта — Мядзведзем, Калядным Дзедам выбралі самага артыстычнага і маладога наведвальніка. А дзяўчына-прыгажуня насіла галоўны атрыбут свята — Зорку.

На Каляды ў музейных залах разгарнулася прадстаўленне сапраўднай батлейкі. Дзеці і бацькі з задавальненнем глядзелі лялечны спектакль пра нараджэнне Хрыста, як глядзелі яго яшчэ нашы продкі больш за 100 гадоў таму.

Напрыканцы вечара кожны наведвальнік рабіў сваімі рукамі эксклюзіўны падарунак Белага Бусліка. У народзе лічыцца: бусел прыносіць шчасце ў дом.

Супрацоўнікі Цэнтра беларускай культуры — Музей Максіма Багдановіча, г. Яраслаўль

Батлейка ў Яраслаўлі

ЗЕМЛЯКІ

Мелодыі матуліных песень

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

"Актыўна працуе камісія па двухбаковым супрацоўніцтве, ужо склаліся цесныя сувязі з МАЗам, "Гомсельмашам", вядзецца і зборка трактараў "Беларусь" у Рубцоўску, — удакладняе С. Антоненка. — Карыстаецца ў нас папулярнасцю беларускае адзенне, пераважна такое і ў маім гардэробе". Гасцююць і на Алтаі афіцыйныя дэлегацыі з Беларусі. Іх абавязкова возяць у Тальменскі раён, на 11-ы кіламетр трасы Барнаул — Новасібірск, да помніка, адкрытага ў 1978 годзе. Ён сімвалізуе братанне Алтая і Хатыні, пра тое і словы на ім паэта Роберта Раждзественскага: "Здесь породнились земля Алтая и земля Хатыни. Да будет свято это братание, эта святыня". Манумент дагледжаны, да яго ўскладваюць кветкі вясельныя пары, асабліва калі жаніх ці нявеста ведаюць пра свае беларускія карані.

Зрэшты, памятаюць пра тое далёка не ўсе нашчадкі перасяленцаў… "Паводле нашых звестак, на Алтаі жыве больш за восем тысяч беларусаў, аднак многія, асабліва маладыя, лічаць сябе рускімі, — акцэнтуе ўвагу С. Антоненка. — Таму ў нашых суполках практычна няма моладзі, работу ладзім у асноўным з пенсіянерамі. Спадзяемся, аднак, усё ж "дастукацца да сэрцаў", прыцягваць і маладзейшых у наша кола, бо разумеем: без іх суполкі не маюць будучыні".

Тым часам некаторыя з беларусаў-алтайцаў спрабуюць і вяртацца на родную зямлю. Сафія Васільеўна расказала пра свайго сябра, які пражыў жыццё на Алтаі, ды так і не пераадолеў настальгію — вяртаецца ў Магілёў. І яна сама падумвала пра такое, хоць з гадамі

Сафіі Антоненцы грэюць душу матуліны песні

няпроста здзяйсняць смелыя планы. Прыязджаючы ў Беларусь, яна, прызналася, "наглядзецца і надыхацца" ёй не можа, бо любіць гэтую зямлю і яе людзей бязмежна. "Я, безумоўна, і Алтай люблю, абедзвюм радзімам ёсць месца у сэрцы маім, — разважае яна. — У Беларусі — гісторыя ўсяго роду, на Алтаі вырасла, там пахаваныя мае бацькі. І ўсё ж так цягне сюды… Пэўна, варта пажыць за мяжой, каб зразумець, як ты любіш Бацькаўшчыну".

Сустракаючыся, алтайскія беларусы спрабуюць і гаварыць па-беларуску, і сагрэць сэрцы роднымі песнямі. Якія ў пашане? "Мой родны кут, Як ты мне мілы,/ Забыць цябе не маю сілы..." — ахвотна заспявала Сафія Васільеўна коласаўскія радкі. І песні часоў СССР многія спяваюць, і новыя накшталт "Чарка на пасашок" з рэпертуару гурта "Бяседа", і "Касіў Ясь канюшыну" таксама сярод найбольш папулярных. Асабліва ж кранаюць пачуцці землякоў "матуліны песні", хоць і не такія папулярныя, аднак чутыя імі з дзяцінства. Дарэчы, заўважае зямлячка, некаторыя з іх ні ў адным даведніку не можа знайсці. Шукала і ў зборніку "Песні беларускага Палесся", і ў сцэнарыях традыцыйных народных святаў, якія падарылі ёй у Міністэрстве культуры. "Пайду я ў садочак, сарву там лісточак,/ Да й панакрываю мілага слядочак…" Расчуленая роднай мелодыяй Сафія Васільеўна нагадала яшчэ, што матуля, як і яна сама, была родам са Старадарожскага раёна Бабруйскай, а цяпер Мінскай вобласці.

Мне пашанцавала! Набраў на пошукавым сайце словы "пайду я ў садочак" — і камп'ютар выдаў некалькі ссылак на розныя варыянты народнай песні. Часткова яна згадваецца і ў рамане Леаніда Дайнекі "Назаві сына Канстанцінам".

Шчырая "матуліна песня" Сафіі Васільеўны сагрэла нашу сустрэчу. А мне падумалася: вось ён, ключ да сэрцаў маладых суайчыннікаў! Калі ў беларускіх суполках будуць гучаць песні, вершы, казкі, перададзеныя нам у спадчыну, то ніхто і не забудзецца, адкуль яго радавод.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Перш за ўсё прыгажосць…

Вальмен Аладаў летась атрымаў ганаровы прыз “Дойлід Беларусі”

Іна Ганчаровіч

Тысячы пакупнікоў і гандляроў з усёй Беларусі, ды і з замежжа добра ведаюць знакамітую Камароўку, там заўсёды шумна, шматлюдна. А гісторыкі сцвярджаюць: рынак быў на тым месцы і два стагоддзі таму. Мне ж помніцца, як у савецкія 70-я гады ля скрыжавання вуліц Куйбышава і Веры Харужай у атачэнні аднапавярховай драўлянай забудовы пачыналася ўзвядзенне крытага рынку. Афіцыйнае ж адкрыццё незвычайнага па тым часе аб’екта ўрачыста правялі напярэдадні маскоўскай Алімпіяды, у маі 1980 года. Велізарная крытая плошча і пры тым без адзінай апоры ў цэнтры — гэта ўражвала. Многія, ведаю, спецыяльна прыязджалі на Камароўку, каб на свае вочы пабачыць архітэктуранае дзіва, бо нічога падобнага ў Беларусі тады не было. Знаўцы казалі: і Заходняя Еўропа не мае збудаванняў падобнага тыпу.

Не ўсе, аднак, ведаюць, што аўтары будынка — група архітэктараў на чале з Вальменам Аладавым. А летась ён атрымаў прыз Беларускага саюза архітэктараў “Дойлід Беларусі”. З Вальменам Мікалаевічам мы гаварылі на розныя тэмы, але ўсе яны так ці інакш былі звязаны з галоўнай справай яго жыцця — архітэктурай. А месцам сустрэчы стала ягоная кватэра на праспекце Незалежнасці. Гэта, дарэчы, больш чым проста жыллё, гэта і музей легендарнага роду Аладавых. Там я, напрыклад, пабачыла мініяцюрныя бюсты і партрэты яго знакамітых бацькоў — кампазітара Мікалая Аладава і заснавальніцы і дырэктара Мастацкага музея Алены Аладавай, карціны беларускіх мастакоў. Уразіла і вялікая калекцыя парцалянавых статуэтак, розных гадоў выпуску і стыляў: дзяўчаты, анёлы, звяркі, птушкі... У пакоі гаспадара месціцца велізарная архітэктурная бібліятэка, там сабрана ўсё, што зроблена ім за доўгі час. Хоць прыгожы дом, як расказаў мне Вальмен Мікалаевіч, будаваўся за грошы праектнага інстытута і для яго супрацоўнікаў, ды атрымаць у ім кватэру ўдалося толькі дзякуючы заступніцтву Пятра Машэрава. Калі ж 4 кастрычніка 1980 года Пётр Міронавіч загінуў у аўтакатастрофе, то і жыццё архітэктара зрабіла “круты віраж”: у 50 гадоў яму давялося пайсці ў выкладчыкі. Пачынаў з пасады старшага выкладчыка, урэшце стаў доктарам, прафесарам.

— Ваш бацька, Мікалай Ільіч Аладаў, — кампазітар, а маці, Алена Васільеўна, — мастацтвазнаўца. Чаму ж вы сталі архітэктарам?

— Я вельмі люблю музыку! Дарэчы, калі вучыўся ў Архітэктурным інстытуце ў Маскве, то заўсёды меў як мінімум чатыры штомесячныя абанементы на кансерваторскія канцэрты. І ўсё ж музыкам я не мог стаць… Вядома, мяне як сына кампазітара аддалі ў музычную школу. Але я дрэнна разумеў, чаго ад мяне хочуць, за што часта атрымліваў па руках ад настаўніцы. Урэшце і жаданне займацца музыкай у мяне знікла яшчэ ў першым класе. А вось архітэктарам стаць мне было наканавана. У 1944 годзе мы жылі ў эвакуацыі ў Маскве, у гасцініцы “Якорь”. Там я пазнаёміўся і пасябраваў з мінчанінам Валодзем Воінавым. Аказалася, што ён — сын вядомага архітэктара Аляксандра Воінава. А пасля вызвалення Беларусі мы вярнуліся ў Мінск, вучыліся з Валодзем у адным класе, нават сядзелі за адной партай. Я, як кажуць, не вылазіў з кватэры Воінавых, і менавіта зносіны з Аляксандрам Пятровічам вызначылі мой лёс.

— Больш за сто вашых архітэктурных праектаў ажыццёўлены, найбольш значныя з іх — мінскія ўніверсамы “Цэнтральны”, “Фрунзенскі”, “Серабранка”, Алімпійскі спарткомплекс і Музей народнага мастацтва ў Раўбічах, клуб-сталовая санаторыя “Беларусь” у Місхоры, піянерлагер у Анапе… І ўсё ж самы маштабны і яркі горада-будаўнічы праект — пэўна ж, Камароўскі рынак. Будынак прыгожы, нестандартны па задуме, ён надае каларыт усяму раёну. Я, аднак, чула, што першапачатковы ваш праект быў яшчэ больш цікавым...

— З Камароўкай атрымалася ўсё выпадкова. Першапачаткова распрацоўка праекта была даручана “Мінскпраекту”, затым яго перадалі ў наш інстытут, шырока вядомы як “Белгипроторг” — Беларускі дзяржаўны інстытут па праектаванні прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання, дзе я быў дырэктарам. Праектам заняўся ўнікальны архітэктар Георгій Сысоеў, ды і яго распрацоўкі забракавалі. Сысоеў пакрыўдзіўся, сышоў з інстытута. Вось тады я з неймаверным нахабствам, бо ў мяне наогул не было вопыту такога будаўніцтва, узяўся за праект. Была распрацавана арыгінальная канструкцыя — дарэчы, такой, наколькі мне вядома, да гэтага часу нідзе не паўтарылі! Уся абалонка даху нашага рынку зборная, а не маналіт. Абалонка сцягнута па перыметры кавалкамі канатаў. Між іншым, першапачаткова купал сапраўды задумваўся крыху іншым, ён і быў пабудаваны з абрысам прыгожай васьмікутнай зоркі. Але прыехаў вялікі чыноўнік, абазваў мяне “ўпрыгожвальнікам”… Урэшце рэшт чатыры прамяні зрэзалі, і застаўся над галавой цяперашні квадрат. За мянушку я, дарэчы, не пакрыўдзіўся і тым да гэтага часу ганаруся, бо лічу архітэктуру мастацтвам. А мастацтва — гэта перш за ўсё прыгажосць.

— Вальмен Мікалаевіч, а ў цяперашнім абліччы Мінск вам падабаецца?

— Мінск — мой родны горад, і я яго, вядома ж, люблю. Калі казаць пра архітэктуру, то яна вельмі розная. Тая частка Мінска, якая пабудавана ў 50-х гадах, гэта архітэктура назаўжды, яна мне бліжэй. А вось цяперашняе захапленне амерыканскай архітэктурай мяне не вельмі ўражвае.

— У вас шмат званняў, узнагарод, прэмій. Летась вы ўшанаваны прызам Беларускага саюза архітэктараў “Дойлід Беларусі”. Што для вас, доктара архітэктуры, акадэміка, члена Акадэмічнага савета Міжнароднай акадэміі архітэктуры “Еўразія”, старшыні Беларускага акадэмічнага цэнтра гэтай акадэміі, азначае такая ўзнагарода?

— Я наогул да ўсякіх такіх рэчаў стаўлюся спакойна. Але гэты прыз мне неяк сагрэў душу... Вядома, я пражыў ужо вялікае жыццё, ды па-ранейшаму знаходжуся ў цэнтры падзей, многае яшчэ ідзе ад мяне, ад маіх аднагодкаў. Так што я ўпэўнены: мае веды, здольнасці яшчэ запатрабаваныя, яны могуць прынесці шмат карысці.

БЕЛТА

На мінскай Камароўцы і прылеглых да рынку тэрыторыях заўсёды шматлюдна

Для Вальмена Аладава архітэктура — галоўная справа жыцця

СУАЙЧЫННІКІ

Усходнія матывы ў навуковым ужытку

Усходазнаўства, арыенталістыка — і цяпер прыцягальны, часам загадкавы кірунак дзейнасці. А што казаць пра мінулыя стагоддзі! У свой час вядомы і ў Беларусі даследчык Ю. Крачкоўскі зазначыў, што ў Расіі яшчэ мала ведаюць усходазнаўцаў “з ваеннага асяродку” і што “такія, несумненна, былі, і нельга іх усіх залічыць без разбору ў групу перакладчыкаў-практыкаў”.

Алесь Карлюкевіч

У паслярэвалюцыйны перыяд рускае ваеннае ўсходазнаўства, яго ўнікальная школа і традыцыі перажылі ўпадак і забыццё. Доўгі час нават гаварыць пра існаванне ў Расіі ваеннага ўсходазнаўства як кірунку ў даследаваннях Усходу лічылася несур’ёзным. І тым не меней, узнікнуўшы ў першай палове XIX стагоддзя як прыкладная, навукова-практычная форма даследаванняў, да 1917 года ваеннае ўсходазнаўства пераўтварылася ў асобную галіну ведаў пра Усход у самым шырокім разуменні. З’явіліся некалькі буйных ваенна-ўсходазнаўчых цэнтраў: у Санкт-Пецярбургу, на Каўказе, у Туркестане, на Далёкім Усходзе. І нават на пачатку XX стагоддзя ў Рускай арміі была спецыяльнасць “афіцэр-усходазнавец” (“афіцэр-арыенталіст”), якая была ўключана ў штатны расклад пагранічных ваенных акруг, карпусоў, дывізій, асобных крэпасцяў і пастоў.

Сучасны даследчык Міхаіл Басханаў падрыхтаваў і выдаў біябібліяграфічны слоўнік “Рускія ваенныя ўсходазнаўцы да 1917 года” (Масква, 2005). У даведніку больш за 400 артыкулаў, у кожным з іх прыводзяцца біяграфічныя дадзеныя, характарыстыка дзейнасці і бібліяграфія. М. Басханаў уводзіць у навуковы ўжытак і імёны шмат каго з ураджэнцаў беларускіх губерняў Расійскай імперыі: Гродзенскай, Віцебскай, Мінскай, Віленскай, Магілёўскай. У слоўніку, як правіла, не ўказваюцца дакладныя месцы нараджэння персанажаў. І ўсё ж выданне можа паспрыяць у якасці апірышча для далейшай адаптацыі многіх постацяў у стасунках з Беларуссю. Найперш хацелася б, каб увагу на працу звярнулі беларускія энцыклапедысты, бо там шмат імёнаў землякоў. Вось, да прыкладу, капітан Іван (Ян) Віктаравіч Віткевіч (1808-1839). Ён родам з Віленскай губерні, за удзел у рэвалюцыйным руху ў 15-гадовым узросце накіраваны радавым на Арэнбургскую лінію. Больш за 10 гадоў праслужыў салдатам. Вывучыў усходнія мовы. Друкаваў важныя звесткі пра Бухарскае ханства. Падарожнічаў па Афганістане і Персіі. У 1839 г. вярнуўся ў Пецярбург — прывёз дзённікі, справаздачы, тапаграфічныя здымкі і планы гарадоў і крэпасцяў Усходняй Персіі і Афганістана.

Ладзілі “Шчадрэц” — з мясцовым каларытам!

Унікальны калядны абрад, які беражліва захоўваюць жыхары вёскі Рог Салігорскага раёна, на стары Новы год быў прадстаўлены ў Музеі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах пад Мінскам

КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

Вясковыя артысты ў Музеі народнай архітэктуры і побыту

Кацярына Мядзведская

Ці даводзілася вам бачыць калі, як па вёсцы ідуць шчадроўнікі, старыя і малыя? Чуваць іх здалёк — гучна песня льецца. Наперадзе — Дзед з берасцянай маскай на твары і бярозавым кіем у руках, на якім завязаны чырвоны бант і прымацаваны званочак. Сталая жанчына нясе самаробную Казу, якая таксама з бантам. Побач скача Конь. Гэту важную ролю выконваюць двое мужчын: адзін пад посцілкай трымае хвост, другі — галаву. Тут жа і Механоша з мяхамі па баках — для пачастункаў. А перад ім хтосьці з каляднай зоркай у руках...

Артысты-вяскоўцы з народнага фальклорнага гурта “Палескія крыніцы” не скупяцца на жарты, прыпеўкі. Калі спыняюцца ля хаты, заводзяць абрадавую песню, якую, дарэчы, спявалі жыхары Рога і сто, і дзвесце год таму. Добрая дарадца калектыву — Таццяна Хаміцэвіч. Жанчыне ўжо больш за 90, аднак памяць у яе — на зайздрасць маладзейшым. Да таго ж яна выдатна ведае мясцовыя традыцыі, таму і павучае моладзь. А вось сапраўдная знаўца мясцовых строяў — кіраўнік гурта Валянціна Цяляк. Яна і сама майстрыха: шые спадніцы, вышывае кашулі, ды і паясы выткаць можа!

У абрадавых сцэнах задзейнічаны ўсе персанажы. Асаблівая ж роля адводзіцца Казе як сімвалу ўраджаю. Пад час гульняў, гутарак, жартоўных сварак гаспадары, зразумела, адорваюць гасцей пачастункамі. Тыя ж танчаць мясцовы танец “Матлет”, а разам з гаспадарамі — “Лявоніху”. Так абыходзяць шчадроўнікі ўсе хаты, дзе іх чакаюць. Потым дзеляць пачастункі, накрываюць стол і сустракаюць стары Новы год.

Дарэчы, “Шчадрэц”, альбо “Шчодрую куццю” ладзяць у многіх рэгіёнах Беларусі. Усюды — свае асаблівасці. Так, на Гомельшчыне калядоўшчыкі ходзяць з Кабылай, з Жоравам — на Міншчыне, з Буслом — на Гродзеншчыне.

Абрад “Шчадрэц” з вёскі Рог унікальны ж тым, што дайшоў да нашых дзён амаль што ў аўтэнтычным выглядзе: мае свой непаўторны мясцовы каларыт. Таму і ўнесены гэты звычай у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

БЕЛТА

Наталля Дамянікава (злева) робіць цуды з саломкі

Імклівы конь з залатою грывай

На персанальнай выставе народнага майстра Беларусі Наталлі Дамянікавай, якая праходзіць у Магілёве, можна пабачыць дзівосныя вырабы з саломкі

Майстар адабрала для экспазіцыі лепшыя творы. Сярод іх — саламяны конь вышынёй больш метра, кампазіцыя “Папараць-кветка”, калядная кампазіцыя, ёлачныя цацкі з саломкі… Вельмі цікавы і творчы праект “Чатыры пары года”. Гэта кампазіцыя з чатырох лялек, якія сімвалізуюць поры года, паказваюць святы і абрады беларусаў: “Гуканне Вясны”, “Купалле”, “Дажынкі”, “Завея”. Прыгожыя лялькі, больш за метр вышынёй кожная, створаны з жытняй саломкі.

Выстава разгорнута ў Магілёўскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці і культурна-асветніцкай працы, дзе з 2003 года Наталля Вітольдаўна працуе метадыстам. Яна ж цяпер узначальвае і аддзяленне Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, плённа супрацоўнічае з іншымі майстрамі і рамеснікамі вобласці. Між іншым, Наталля Дамянікава была ўдастоена звання “Чалавек 2010 года”.

Выстава прымеркавана да 20-годдзя творчай дзейнасці. “Кампазіцыі з палявых кветак — рамонкаў, васількоў, званочкаў, — а таксама з ружаў самыя мае любімыя, — прызналася майстар. — Работы вялікія, пад метр і паўтара ў вышыню”. Цяпер яна робіць дзве вялікія кампазіцыі. Якія? пакуль сакрэт. Бо, лічыць Наталля, як скажаш каму, то не так добра атрымаецца...

КРЫЖАВАНКА

Снежная казка

Паводле зімовай лірыкі беларускіх паэтаў

Па гарызанталі:

5. “На Новы год пасвяткаваць\\У … завітала ёлка”. З верша “Ёлка” Максіма Танка. Сёлета — 100 год з дня нараджэння паэта. 6. Чарада птушак, рыб. 7. Як студзень цёплы на лік — дык завідны …(прык.). 8. Хутар непадалёк ад в. Мікалаеўшчына (Стаўбцоўшчына), дзе ў 1912 годзе ўпершыню адбылася сустрэча Янкі Купалы з Якубам Коласам. 11. “І … будзе, і кілбаска”. З верша Я. Коласа “Тосты” (“Пад Новы 1948 г.”) . 12. “Ноч далёка рассцілае\\Снягоў белых …”. З паэмы Я. Коласа “Сымон-музыка”. 13. “І ходзіць паважна … па бары,\\Злы, белавалосы”. З верша Я. Коласа “Ноч пад Новы год”. 16. “І лягла …\\У бары за гарой”. З верша Я. Купалы “Зімой у лесе”. 17. … або астачу каляднай куцці некалі падкідвалі пад столь, каб рос высокі ячмень. 18. “Куцця. Марозна. Хмурнавата.\\... падкідвае заўзята”. З паэмы Я. Коласа “Новая зямля” (“Каляды”). 20. Той, хто вядзе банкет. 22. Тое, што і настольнік; некалі на калядную вячэру пад … клалі салому, каб добра ўрадзіла збажына. 23. “Сіверна, … ;\\Забірае дрож”. З верша Я. Купалы “Зімовая ноч”. 26. “Свішча … за сцяною,\\У коміне вые”. З верша Я. Коласа “Мяцеліца”. 29. “Ну і мароз — аж нос зрывае! А на ўсходзе … грае!”. З паэмы Я. Коласа “Новая зямля” (“На рэчцы”). 30. Свята, якое на Беларусі пачыналі адзначаць напярэдадні 1 студзеня і працягвалі да трэцяй Куцці. 31. Тое, што і кросны. 32. “Бура … так спявала”. З верша Я. Коласа “У мяцеліцу”.

Па вертыкалі:

1. У … кожны молад (прык.). 2. Ягады, якімі зімой любяць ласавацца птушкі. 3. Ярка-чырвоная фарба. 4. “І …, і лес пануры\\Новы год віталі”. З верша Я. Коласа “Пад Новы год” (1914 г.). 9. “Даставайце з вышак …”. З верша Я. Коласа “Зіма”. 10. “Мне … і мядзведзь у паслугах”. З верша Я. Купалы “Мароз”. 14. Адтуліна, прасечаная ў лёдзе ракі, возера. 15. “Снег на Куццю — грыбы на лета,\\Такая матчына …”. З паэмы Я. Коласа “Новая зямля” (“Каляды”). 19. Калі напярэдадні Калядаў … зорнае — будуць несціся куры (прыкм.). 21. “Эх, мароз, эх, … жартлівы!”. З паэмы Я. Коласа “Сымон-музыка”. 24. Тое, што і падмурак. 25. “Так высыпаў ззябна, бязрадасна снег\\У першы папас свой, у першы …”. З верша Я. Купалы “Першы снег”. 27. Дарагая тая хата, дзе любяць госця і …(прык.). 28. Тое, што і прывід.

Склаў **Лявон Целеш.**

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 5. Горад. 6. Касяк. 7. Сакавік. 8. Смольня. 11. Чарка. 12. Палатно. 13. Мароз. 16.Цішына. 17. Рэшткі. 18. Сняжок. 20. Тамада. 22. Абрус. 23. Марозна. 26. Вецер. 29. Чырвань. 30. Шчадрэц. 31. Ставы. 32. Песні.

Па вертыкалі: 1. Холад. 2. Рабіна. 3. Кармін. 4. Зямля. 9. Сані. 10. Воўк. 14. Палонка. 15. Прымета. 19. Неба. 21. Дзед. 24. Аснова. 25. Начлег. 27. Свята. 28. Здань.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў

Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

E—mail: golas_radzimy@tut.by

Аб’ём выдання: 1 друк. арк.

Тыраж: 1945, **Заказ:** 0070

Час падпісання ў друк: 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». *ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск*

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© **“Голас Радзімы”, 2012**